## *РЭЦЭНЗІІ*

# МЕНТАЛІТЭТ БЕЛАРУСАЎ

Сістэмная трансфармацыя беларускага грамадства, пабудова ўласнай дзяржаўнасці, станаўленне шматвектарнай знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці выклікалі патрэбу асэнсавання нацыянальнай самабытнасці. У дадзеным кантэксце рэцэнзаваная манаграфія В. В. Кірыенкі (Кірыенка В. В. Беларуская ментальнасць: вытокі, сучаснасць, перспектывы. Гомель: ГДТУ імя Сухога, 2009. – 319 с.) з'яўляецца надзвычай актуальнай. Аўтар манаграфіі прапануе і поўна рэалізуе шматаспектны, міждысцыплінарны падыход да даследавання беларускага менталітэту як сацыякультурнага феномена, які арганічна спалучае гісторыка-генетычны, філасофска-сацыялагічны, культуралагічны і сацыяльна-псіхалагічны аналіз. Такі падыход дазваляе раскрыць прыроду беларускага менталітэту, вызначыць магістральныя тэндэнцыі яго развіцця. Неабходна адзначыць, што В. В. Кірыенка больш за 15 год займаецца вывучэннем менталітэту славян. Пад яго кіраўніцтвам праведзена пяць міжнародных навуковых канферэнцый «Менталітэт славян і інтэграцыйныя працэсы: гісторыя, сучаснасць, перспектывы». Ён адзін з першых не толькі ў Беларусі, але і ў постсавецкай прасторы прымяніў сацыялагічныя метады даследавання такой складанай з'явы, як менталітэт, распрацаваў метадычныя прынцыпы вымярэння ментальных характарыстык сучасных беларусаў у супастаўленні іх з аналагічнымі характарыстыкамі славянскіх народаў – рускіх, украінцаў, палякаў. Распрацаваная ім методыка аналізу і апісання менталітэту паспяхова выкарыстоўваецца ў міждысцыплінарных даледаваннях.

Манаграфія заснавана як на глыбокім вывучэнні аўтарам этнакультурных, этнасацыялагічных, сацыяпсіхалагічных, гістарычных беларускіх і замежных тэарэтычных крыніц, так і на выкарыстанні вынікаў уласных даследаванняў. Карэктнае прымяненне класічнай тэарэтычнай спадчыны Э. Дзюркгейма, Т. Парсанса, П. Сарокіна, К. Юнга, Л. Леві-Бруля, Л. Гумілёва дазволіла аўтару скласці метадалагічную базу для даследавання міждысцыплінарнага феномена нацыянальнага менталітэту.

У наш час катэгорыя «менталітэт» шырока выкарыстоўваецца ў паняційных апаратах псіхалогіі, культуралогіі, этнаграфіі, паліталогіі, сацыялогіі, якія па-рознаму вызначаюць яго прадметнае поле, структуру і функцыі. У сувязі з гэтым лічым удалым прыменены аўтарам метад мадэлявання менталітэту, які дазваляе наглядна ўявіць яго як у статыцы, так і ў дынаміцы. Пад менталітэтам В. В. Кірыенка разумее «сацыяльна-культурны свядома-бессвядомы феномен, які прадстаўляе пласт гістарычнай памяці, «спрасаванага» сацыяльнага вопыту як папярэдніх, так і сучасных пакаленняў, што прадвызначае сінхранізацыю перажыванняў і алгарытмаў сацыяльнага дзеяння большасці членаў соцыуму, забяспечваючы яго цэласнасць у прасторы і часе ў розных умовах грамадскага развіцця» (с. 30). Як абгрунтавана адзначае аўтар, укаранёны ў нацыянальнай культуры менталітэт з'яўляецца «скрэпай», якая ўтрымлівае этнас ад распаду ў складаных, у тым ліку і крызісных, сацыяльных умовах, забяспечвае яго ўнутраную цэласнасць, па-першае, у прасторы, паколькі яго базавыя характарыстыкі выбудоўваюць сістэму ідэнтыфікацыйных маркераў, якія вызначаюць, дзе заканчваецца тэрыторыя, на якой жывём «мы», і пачынаецца тэрыторыя, на якой жывуць «не мы», «іншыя»; па-другое, у часе (якія пастаянныя агульныя каштоўнасці для этнасу былі «ўчора», дарагія «сёння» і застануцца духоўнымі арыенцірамі «заўтра») (с. 8–9).

Манаграфія В. В. Кірыенкі прадстаўляе самастойную навуковую працу, кампазіцыйна вытрыманую, у якой спалучаны сацыялагічны аналіз аб'екта даследавання і тэарэтычнае абагульненне эксперыментальна атрыманых вынікаў. Яна складаецца з пяці глаў.

Першую главу складаюць тэарэтыка-метадалагічныя асновы сацыялагічнага даследавання менталітэту: прадметнае поле, структура і функцыі менталітэту, прынцыпы даследавання менталітэту як выніку этнагенезу, механізмы фарміравання і праяўлення менталітэту. Тут вызначаны структура, функцыі і характарыстыкі менталітэту, важнейшымі з якіх з'яўляюцца: латэнтнасць, канстантнасць, амбівалентнасць, узаемазвязанасць, агрэгатнасць, а таксама асноўныя формы менталітэту: групавы, этнічны, нацыянальны. У адпаведнасці з выпрацаванай методыкай сацыялагічнага даследавання менталітэту В. В. Кірыенка прымяняе комплексна-сістэмны падыход да аб'екта даследавання, у тым ліку шырока выкарыстоўвае метад мадэліравання сацыяльных працэсаў як важнейшы спосаб іх пазнання. Аўтарская методыка, паводле якой мяркуецца адначасовае ажыццяўленне працэсаў аўтаідэнтыфікацыі, гетэраідэнтыфікацыі беларусамі іншых этнасаў, ідэалізацыі і гетэраідэнтыфікацыі беларусаў іншымі этнасамі, забяспечвае пабудову чатырохмернай ментальнай мадэлі партрэта сучасных беларусаў.

У другой главе даецца характарыстыка ўмоў генезісу беларускага этнасу і менталітэту беларусаў, раскрываюцца механізмы ўплыву прыроднага ландшафту, геапалітычнай і этнаканфесійнай сітуацыі на фарміраванне базавых сацыякультурных і вытворча-гаспадарчых алгарытмаў жыццядзейнасці, беларускага этнанацыянальнага менталітэту. Робіцца важнейшы вывад пра тое, што, знаходзячыся ў пастаянным узаемадзеянні з культурна-цывілізацыйнымі Усходам і Захадам, Поўначчу і Поўднем, беларускі этнас выпрацаваў свае спецыфічныя, уласцівыя толькі яму характарыстыкі, сфармуляваў свой унікальны геапалітычны, сацыякультурны статус – флуктуацыі, які аб'ядноўвае культурна-цывілізацыйныя Поўнач і Поўдзень, Усход і Захад.

Асаблівую цікавасць, на наш погляд, выклікае трэцяя глава манаграфіі, у якой змяшчаецца абгрунтаваны сацыялагічны аналіз ментальнай ідэнтычнасці сучасных беларусаў. У выніку правядзення ментальнай ідэнтыфікацыі аўтарам пабудаваны ідэальны ментальны партрэт і ментальны аўтапартрэт сучасных беларусаў у супастаўленні з ментальнымі партрэтамі рускіх, украінцаў, палякаў, літоўцаў, немцаў і амерыканцаў; пабудавана сегментаваная дынамічная мадэль ментальнага партрэта сучасных беларусаў. Вынікі даследавання паказалі, што самы камфортны стан беларускія рэспандэнты адчуваюць пры ацэнцы блока сацыяльна-духоўных характарыстык, а асноўны вектар напружанасці ў іх размяшчаецца ў разрыве паміж ідэальнымі ацэнкамі і самаацэнкамі рацыянальна-дзейнасных і ліберальных, індывідуалістычных характарыстык. Аўтар указвае, што адным з важнейшых фактараў, якія вызначаюць нацыянальны менталітэт, з'яўляецца суаднесенасць у ім калектывісцкага і індывідуалістычнага кампанентаў. Вынікі даследавання паказалі, што сучасныя беларусы ў розных сферах свайго жыцця хацелі б у розных спалучэннях рэалізаваць індывідуалістычна-калектывісцкія кампаненты. Так, максімальны, практычна абсалютны, калектывізм беларускія рэспандэнты зафіксавалі ў сітуацыях абароны Радзімы. Разам з тым, хутчэй індывідуалістамі, чым калектывістамі, яны хацелі б быць у паўсядзённым сямейным жыцці, у размеркаванні і выкарыстанні вынікаў працы, у выбары каштоўнасных арыентацый, культурных пераваг.

Чацвёртая глава прысвечана аналізу сучаснага тэмпарытму менталітэту беларусаў. Адзначаецца, што адным з важнейшых кампанентаў нацыянальнага менталітэту з'яўляецца спецыфіка адчування часу. Сучасным заходнім цывілізацыям уласціва рацыянальнае, дакладна-выяўленае лінейнае ўспрыманне прасторы і часу, якія прымушаюць выбудоўваць у строгай паслядоўнасці як сам прадметны свет, так і дзеянні, накіраваныя на яго асваенне. Усходняя цыклічная мадэль адчування часу, дэтэрмінаваная прыродна-цыклічным модусам сялянскага ладу жыцця, характарызуецца ўстойлівасцю, паўтаральнасцю цыклаў: сутачных, месячных, гадавых, жыццёвых, векавых, цывілізацыйных. На думку В. В. Кірыенкі, у працэсе сістэмнай трансфармацыі грамадскага жыцця характэрнае для беларусаў цыклічнае адчуванне часу паступова замяняецца лінейным. Але паколькі адчуванне часу з'яўляецца важнейшай састаўной часткай менталітэту, гэты працэс наўрад ці будзе адбывацца вельмі хутка.

Заключная глава прысвечана аналізу механізмаў узаемадзеяння менталітэту сучасных беларусаў з асноўнымі сферамі трансфармаванага беларускага грамадства. Аўтарам адзначаецца актуалізацыя неабходнасці самаідэнтыфікацыі Беларусі на культурна-цывілізацыйнай восі «Усход– Захад». Устаноўленае ў працэсе даследавання супадзенне большасці ментальных харак-

тарыстык рускіх, украінцаў, беларусаў сведчыць пра тое, што паняцце «ўсходнеславянскае адзінства» засноўваецца на камплімснтарных беларуска-расійска-украінскіх ментальных характарыстыках, таму інтэгравацца ў розныя аб'яднанні Расіі, Украіны і Беларусі эканамічна, палітычна і сацыякультурна мэтазгодна разам. Аналізуючы генезіс, этапы і формы станаўлення шматукладнай эканомікі, фарміравання недзяржаўнага сектара Беларусі, аўтар робіць вывад аб тым, што недзяржаўнае прадпрымальніцтва ўяўляе сабой асобную сацыякультуру, рэальныя цяжкасці станаўлення якой звязаны з фарміраваннем культурна-цывілізацыйнага поля, якое грунтуецца на ментальных характарыстыках беларусаў, што падтрымліваюць і стымулююць станаўленне новага рэальнага сектара эканомікі.

Высока ацэньваючы рэцэнзаваную навуковую працу, хацелася б звярнуць увагу і на існуючыя ў ёй некаторыя недахопы, ліквідацыя якіх дазволіць у далейшым паглыбіць веды даследуемага аўтарам феномена: аўтарская методыка вымярэння ментальных характарыстык з'яўляецца перш за ўсё сацыялагічнай, а сутнасць менталітэту праяўляецца не толькі на сацыяльным, але і на псіхалагічным узроўні, у сувязі з чым у будучых даследаваннях было б правамерным прымяненне і спецыфічных псіхалагічных методык; каб прасачыць дынамічныя працэсы ў менталітэце беларусаў, пажадана ўвесці элементы маніторынгавага даследавання; паколькі аўтарам заяўлены і ў значнай ступені рэалізаваны метад кроскультурнага даследавання этнанацыянальнага менталітэту, у будучым мэтазгодна арганізацыя даследавання славянскага менталітэту як у Беларусі, так і ў вядучых цэнтрах Расіі, Украіны і Польшчы.

Адзначаныя недахопы не зніжаюць высокага прафесійнага ўзроўню манаграфіі. Яна змяшчае шэраг бясспрэчна арыгінальных высноў, адрозніваецца карэктным палемічным стылем, уносіць істотны ўклад у рашэнне актуальнай праблемы этнанацыянальнай ідэнтыфікацыі беларускага народа ў сацыякультурнай і геапалітычнай еўрапейскай і сусветнай прасторы. Аўтарам на аснове сістэмнага, міждысцыплінарнага падыходу да вывучэння менталітэту выяўлена і доказна інтэрпрэтавана роля гэтага феномена ў эканамічных, палітычных і сацыякультурных працэсах. Распрацавана чатырохмерная мадэль этнанацыянальнага менталітэту, што ўключае наступныя яе экспазіцыі: інтрамадэль, экстрамадэль, ідэальная, дынамічная і сегментаваная мадэлі. Распрацавана мадэль уплыву этнаўтваральных фактараў: прыродна-кліматычных умоў, геапалітычнага ландшафту, сацыякультурных, міжэтнічных і міжнацыянальных адносін на фарміраванне этнанацыянальнага менталітэту і ўплыву менталітэту на пераўтварэнне прыродна-кліматычных умоў, геапалітычнага ландшафту, сацыякультурнага асяроддзя.

Такім чынам, перад намі глыбокае і арыгінальнае даследаванне беларускай ментальнасці. Спадзяемся, што кніга будзе цікавая тым, хто вывучае гісторыю станаўлення беларускага этнасу і беларускай нацыі, матэрыяльную і духоўную культуру, менталітэт беларусаў.

*А. Ю. САВЕНКА*